***Сілюк Нона Уладзіміраўна***, настаўнік беларускай мовы і літаратуры вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі ДУА «Навучальна-педагагічны комплекс Юрацішкаўскі яслі-сад – сярэдняя школа» Іўеўскага раёна

**Працуем з тэкстам на ўроках беларускай мовы**
**(дыдактычны матэрыял па лексічнай тэме "Ежа")**

Лёгкі хлеб

Касіў на лузе касец. Змарыўся і сеў пад кустом адпачыць. Дастаў торбачку, развязаў і пачаў есці.

*Выходзіць з лесу галодны воўк.* Бачыць, што касец пад кустом сядзіць і нешта есць.

Падышоў да яго воўк:

- Ты што ясі, чалавеча?
- Хлеб, - адказвае касец.
- А смачны ён?
- Дзіва, што смачны!
- Дай мне пакаштаваць.
- Калі ласка.

Адламаў касец кавалак хлеба і даў ваўку. Спадабаўся ваўку хлеб. (Народная казка)

Магчымыя заданні:

Пры вывучэнні раздзела *Сінтаксіс. Пунктуацыя. (5 клас)*

1. Выпішыце з тэксту адно назоўнікавае і адно дзеяслоўнае словазлучэнне.
2. Назавіце сказы з аднароднымі членамі сказа.
3. Выдзелены сказ перабудуйце ў неразвіты.
4. Выпішыце сказ са звароткам. Пабудуйце свой сказ з гэтым зваротκам.
5. Разбярыце па членах сказа перадапошні сказ.
6. Растлумачце значэнне падкрэсленага слова. Падбярыце да яго сінонімы. Складзіце з ім свой сказ.
7. Да якога стылю і тыпу адносіцца гэты тэкст? Абгрунтуйце адказ.
8. Успомніце працяг казкі. Як вы разумееце назву казкі?
9. У якіх яшчэ значэннях можа ўжывацца слова *хлеб*?
10. Прыдумайце невялікі тэкст-разважанне "Чаму трэба шанаваць хлеб?"

— Ану, давай, брат, запрабуем,
Хоць на *цікавасць* пакаштуем,
Які тут сок на новым месце?
Мо з хлебам можна яго есці? (Я.Колас)

Магчымыя заданні:

Пры вывучэнні раздзела *Фанетыка і арфаэпія. Графіка і арфаграфія (5 клас)*

1. Назавіце словы, у якіх ёсць зацвярдзелыя гукі.
2. Выпішыце словы, у якіх літары е, ё, я, ю, абазначаюць 2 гукі і ўключыце іх ў невялікі дыялог.
3. Выпішыце словы з суседняй мяккасцю і складзіце з імі сказы.
4. Зрабіце фанетычны разбор выдзеленага слова. Падбярыце да яго сінонімы.
5. У якіх словах сустракаецца няпарны мяккі гук? Прывядзіце свае прыклады слоў з гэтым гукам.
6. Ці ведаеце вы, з якога твора ўзяты гэтыя радкі?

Сказаць шчыра, чай я піў рэдка (піў малако ці ваду з вядра), гэтую ікру недалюблівау за яе кісласць, (у тыя разы, бывала, і згортваў яе ўпотай пальцам з лустачкі, выкідваў), але цяпер узяўся сілкавацца, каб і наталіць голад, і паддаць апетыту Міцю. Раней я першы *з'ядаў* усё, а цяпер стараюся не спяшацца, хоць яблыкі, якія дасць цётка Вера пасля, мяне вельмі вабяць. Я адзін з'еў бы іх усе на гэтай вазе. (Г. Далідовіч)

Магчымыя заданні:
Пры вывучэнні раздзела *Фанетыка і арфаэпія. Графіка і арфаграфія (5 клас)*
1. Назавіце словы, у якіх вымаўленне і напісанне не супадаюць. Патлумачце свой выбар.
2. Выпішыце слова, у якім колькасць гукаў і літар не супадае. Складзіце з ім складаны сказ.
3. Прывядзіце прыклады слоў на правапіс е, ё, я ў беларускай мове. Патлумачце іх напісанне.
4. Сфармулюйце правіла напісання *у* і *ў* у беларускай мове. Прывядзіце прыклады з тэксту.
5. Знайдзіце ў тэксце слова з прыстаўным зычным. Складзіце з ім сказ з аднароднымі членамі.
6. Растлумачце правапіс апострафа ў выдзеленым слове. Прывядзіце прыклады слоў з апострафам.

У народзе кажуць: "У каго хлеб, у таго і шчасце". Што мы прыгадваем, калі бачым свежы, румяны бохан хлеба на белым абрусе, калі ўдыхаем яго водар-пах? Можа, налітыя каласы, патрывожаныя гарэзам-ветрыкам. Можа, блакітныя вочкі пяшчотных васількоў у жыце. Можа, мазолістыя рукі бацькі ці мяккія матчыны далоні. Кожны чалавек звязвае са словам *хлеб* свае асабістыя адчуванні. Аднак для ўсіх нас хлеб – крыніца жыцця. Мне прыгадваюцца словы С. Законнікава:

Ля печы маці б'е паклоны,
І кожны з іх як адкрыццё.
На залатых далонях клёна
Ляжаць не боханы – жыццё.

Кажуць: “Пакуль ёсць хлеб ды вада – усё не бяда” Усё самае смачнае прыядаецца, а хлеб – ніколі, хоць мы ядзім яго кожны дзень. Хлеб дарагі нам не толькі як прадукт харчавання, ён – мера дастатку, сімвал міру, чалавечай дабрыні. Наша пашана да хлеба – гэта пашана да працы мільёнаў людзей. Хлеб – самае дарагое пасля маці і Бацькаўшчыны. Пагарджаць ім грэшна, недаравальна, злачынна, недастойна чалавека высакароднага. Адносіны да хлеба – гэта адзін са сродкаў вымярэння маральных якасцяў асобы. (З сачынення вучаніцы)

Магчымыя заданні:
Пры вывучэнні раздзела *Марфалогія і арфаграфія. (6 – 7 клас)*

1. Знайдзіце ў тэксце прыклады назоўнікаў канкрэтных, абстрактных, рэчыўных, уласных, агульных.
2. Якія назоўнікі асацыіруюцца ў вас са словам *хлеб?*
3. Выпішыце па 2 прыклады назоўнікаў розных тыпаў скланення з тэксту.
4. Вызначце склон назоўнікаў у першых трох сказах.
5. Знайдзіце ў тэксце прыклады прыметнікаў якасных, адносных, прыналежных. Прыдумайце з імі свае словазлучэнні.
6. Да назоўнікаў *хлеб, праца* падбярыце па два якасныя, адносныя, прыналежныя прыметнікі.
7. Вызначце разрады займеннікаў, што сустракаюцца ў тэксце.
8. Вызначце спражэнне дзеясловаў, ужытых у тэксце. Запішыце іх у форме 2 асобы множнага ліку цяперашняга ці будучага часу абвеснага ладу.
9. З дзеепрыметнікамі, ужытымі ў тэксце пабудуйце свае сказы. Патлумачце знакі прыпынку ў іх.
10. Зрабіце марфемны разбор прыслоўяў, ужытых у тэксце.
11. Выканайце марфалагічны разбор любога прыназоўніка і злучніка з тэксту.
12. Дапоўніце тэкст уласнымі разважаннямі на акрэсленую тэму.
13. Успомніце, якія вы ведаеце яшчэ прыказкі пра хлеб. Уключыце іх ва ўласнае выказванне.

У вёсцы здаўна асноўным у харчаванні быў жытні хлеб. На святы выпякалі пшанічныя пірагі з начынкай і без яе. У якасці начынкі ў скаромныя тыдні ўжываліся вантробы, тварог, яйкі, а ў посныя дні – каша, мак, грыбы і рыба. Перш чым рашчыняць хлеб і мясіць цеста, жанчына павінна была чыста памыцца і перахрысціцца, прызваўшы ў сведкі бога, каб хлеб удаўся і добра падышоў. Не раілася рашчыняць цеста ў кепскім настроі, бо гэта, паводле павер’я, уплывала на яго якасць (цеста будзе вадзяное і хлеб у печы будзе расплывацца). Пры пасадцы хлеба непажадана было каму-небудзь знаходзіцца на печы. Калі хлеб выпякаўся ў печы, не раілася ў гэты час гучна размаўляць, спрачацца ў доме, прымаць выпадковых наведвальнікаў, бо з-за гэтага ён можа патрэскацца. З такой далікатнасцю і пашанай адносіліся і да

начыння, якім карысталіся для прыгатавання хлеба, асабліва дзяжы. Пасля абеду акраец хлеба, загорнуты ў чысты ручнік, звычайна пакідалі на стале. (З газеты "Звязда")

Магчымыя заданні:
Пры вывучэнні раздзела *Сінтаксіс. Пунктуацыя. (8 клас)*

1. Выканайце сінтаксічны разбор першых трох сказаў. Патлумачце знакі прыпынку ў трэцім сказе.
2. Выпішыце сказ з дзеепрыметнікавым зваротам, патлумачце знакі прыпынку ў ім.
3. Сказ, у якім ёсць дзеепрыслоўны зварот, разбярыце па часцінах мовы. З дзеепрыслоўным зваротам складзіце свой сказ, ускладнены аднароднымі членамі сказа.
4. На аснове прапанаванага тэксту складзіце дыялог, выкарыстоўваючы наступныя выразы: *скажыце, калі ласка; а ці вядома вам; як бачыце; я звярнуў увагу яшчэ на тое, што…*
5. Паспрабуйце скласці меню абеду ў посны дзень ( у скаромны дзень).

Цыбулі ў старажытнасці прыпісвалі *містычныя ўласцівасці*. Рымскія ваяры насілі цыбуліну ў якасці *амулета,* лічачы, што яна ахоўвае іх ад нягод і небяспек. Рускія таксама цанілі яе ўласцівасці на полі бою, але інакш: тры цыбуліны, укладзеныя ў левы бот, павінны былі зрабіць салдата *жывым жахам*, ад аднаго выгляду якога вораг скаланаецца і кідаецца наўцёкі. Па павер'ях гэта расліна таксама адпуджвала змей, а то й вылечвала ад іх атруты. Сярод шматлікіх *чароўных уласцівасцяў* ёсць і пацверджаныя сучаснай медыцынай - здольнасць супрацьстаяць цынзе і прастудзе. (З газеты "Звязда")

Магчымыя заданні:
Пры вывучэнні раздзела *Сінтаксіс і пунктуацыя. (9 клас)*

1. Прачытайце тэкст. Падзяліцеся аб прачытаным, выкарыстоўваючы наступныя словы: *аказваецца; цікава, што; дзіўна, але; не забывайце…*
2. Выканайце поўны сінтаксічны разбор усіх складаных сказаў.
3. Дапоўніце першы сказ, каб атрымаўся складаназлучаны (складаназалежны, бяззлучнікавы).
4. Выдзеленыя словы і словазлучэнні уключыце ва ўласны дыялог.